Калектыў вучоных і выкладчыкаў нашага універсітэта ўносіць пэўны ўклад у ажыццяўленне рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы. Паляпшаюцца шэфства над ёй, прафарыентацыя вучняў, важнай агульнадзяржаўнай праблеме прысвячаюцца актуальныя навуковыя распрацоўкі. Усё больш узрастае роля гурткоў юных па розных спецыяльнасцях, якія працуюць пры факультэтах ГДУ.

Шэфскія кантакты ўстанавіліся паміж кафедрай філасофіі і гомельскай СШ № 11. Для тых, хто па-сапраўднаму цікавіцца гэтай навукай, выдадзены індывідуальныя планы для яе паглыбленага вывучэння. Школьнікі запрашаюцца да ўдзелу ў студэнцкіх навуковых канферэнцыях.

Гэтыя здымкі былі зроблены на нядаўна прайшоўшай ва універсітэце канферэнцыі па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, якая завяршыла першы тур Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ. На секцыі філасофіі з дакладам «Эвалюцыя палітычных поглядаў Гарацыя» выступіў і васьмікласнік СШ № 11 Алег Кавалёў.





Фота Д. Баярына.

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

# НЕ БУДЗЕ МЕСЦА СУМУ

Кажуць, што ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела. А ці так гэта? Даволі часта можна пераканацца ў адваротным: камсамольская група жыве нецікава, аднастайна. Але ж цікава будзе толькі тады, калі група стане калектывам. Не сакрэт, што стварыць згуртаваны калектыў у акадэмічнай групе ўдаецца далёка не ўсім. Чаму? Няма агульнай справы, за якую б хварэў кожны.

Такую справу знайшлі для сябе камсамольскія групы матэматычнага факультэта. Яны арганізавалі конкурс маладзёжнай песні. Да яго старанна рыхтаваліся: маляўніча аформілі аўдыторыю, стварылі кампетэнтнае журы.

Радуе тое, што ў гэтым конкурсе прынялі актыўны ўдзел студэнты-першакурснікі. Іх выступленне задавала тон усяму конкурсу. У песнях, якія яны выконвалі, гучала трывога аб будучым чалавецтва, надзея на мірнае заўтра. Падрыхтоўка і ўдзел у конкурсе згуртавалі калектывы груп, дапамаглі першакурснікам уліцца ў грамадскае жыццё факультэта.

Члены журы аднадушна прызналі пераможцамі студэнтаў гр. М-13 і М-12. Ім прысуджана першае і другое месцы. Чацвёртакурснікі (гр. ПМ-46) занялі трэцяе месца.

Пераможцам уручаны дыпломы. Заахвочвальных дыпломаў удастоіліся і асобныя выканаўцы, чые выступленні вельмі спадабаліся гледачам.

Хочацца пажадаць камітэту камсамола матфака праводзіць больш такіх цікавых і карысных спраў. Тады на факультэце не будзе месца суму.

**К. УДАВЕНКА,**
**член штаба «Камсамольскага пражэктара» матэматычнага факультэта.**

«ДНІ ЭКАНАМІСТА»

# ПА ЦІКАВАЙ ПРАГРАМЕ

Аб тым, што ў сярэдзіне бягучага месяца на эканомфаку праводзіліся традыцыйныя «Дні эканаміста», бачна было па ўсім: усхваляваных і заклапочаных тварах студэнтаў і выкладчыкаў, гумарыстычных плакатах і малюнках, развешаных у калідоры трэцяга паверха. Як звычайна, традыцыйныя дні прымяркоўваліся да чарговай гадавіны з дня ўтварэння факультэта. Сёлета яны прысвячаліся 15-годдзю эканомфака.

На ўрачыстым адкрыцці «Дзён эканаміста», якое адбылося ў фае галоўнага корпуса, выступілі дэкан эканомфака прафесар У. Д. Арэшчанка, нам. сакратара камітэта камсамола універсітэта А. Шалдукова. Вечарам таго ж дня ў кафэ ГДУ адбылася цікавая сустрэча чацвёртакурснікаў - эканамістаў з будучымі геолагамі.

На наступны дзень гасцінна запрашала наведвальнікаў выстаўка студэнцкай творчасці факультэта, адкрытая ў фае галоўнага корпуса, а агітбрыгада эканомфака адправілася з канцэртам да вучняў СШ № 26 г. Гомеля. У сваю чаргу ў госці да эканамістаў прыйшлі на наступны дзень і вучні СШ № 16. Ім былі паказаны студэнцкі тэлецэнтр, лабараторыі з вылічальнымі машынамі, сродкамі збору і апрацоўкі інфармацыі.

У традыцыйныя дні адбыўся кніжны кірмаш, быў адкрыты вельмі ўтульны бар, у якім гарэлі свечкі, гучала музыка. Кожны жадаючы мог пакаштаваць салодкія пачастункі, кандытарскія вырабы, выпечаныя самімі студэнтамі.

На навуковай канферэнцыі, якая праходзіла ў перадапошні дзень свята, працавалі секцыі галіновых эканомік, эканамічнага аналізу, машыннай апрацоўкі інфармацыі, эканомікі працы. На іх выступілі госць з Іванаўскага дзяржуніверсітэта В. Чарнышоў, студэнты-эканамісты ГДУ А. Чубенка, М. Шпакоўскі, С. Самаукіна, С. Папасёмава, А. Шарова, Т. Паташкіна і інш. Усе выступаючыя былі ўзнагароджаны граматамі камітэта камсамола універсітэта за ўдзел у XV студэнцкай навуковай канферэнцыі.

Цікавай, як заўсёды, была прэс-канферэнцыя паміж выкладчыкамі і студэнтамі факультэта, а вечарам у актавай зале адбыўся канцэрт. Перад яго пачаткам нам. дэкана М. В. Герасімчык і сакратар камітэта камсамола факультэта С. Самаукіна ўручылі Ганаровыя граматы камітэта ЛКСМБ ГДУ і сувеніры самым актыўным выпускнікам А. Цяпугінай, М. Мельнікавай, П. Пятрушы, К. Шклярэнку і інш. У канцэрце, які потым адбыўся, прынялі ўдзел і гаспадары і госці свята.

У нядзелю традыцыйныя дні завяршыліся. Адбылося першынство па міні-футболу, у якім перамаглі пяцікурснікі аддзялення АМАЭІ, другое месца заняла каманда першага курса аддзялення эканомікі працы. Вечарам доўга не змаўкаў смех у актавай зале, дзе праходзіла гумарыстычная праграма, затым пачалася дыскатэка.

Крыху сумна было ад таго, што закончылася свята. Але ўспаміны аб ім застануцца ў нашых сэрцах надоўга.

**І. НЕШЫК,**
**старшыня прэс-цэнтра эканамічнага факультэта.**

# У ДЗЕНЬ ВЫЗВАЛЕННЯ

**26-га лістапада споўнілася 42 гады з дня вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.** Гэтай памятнай даце ва універсітэце былі прысвечаны шматлікія мерапрыемствы. У дзень вызвалення ва універсітэцкім парку ля брацкай магілы адбыўся мітынг. На ім выступіў ветэран Вялікай Айчыннай вайны, былы лётчык, які ўдзельнічаў у вызваленні Гомельшчыны, падпалкоўнік у адстаўцы А. А. Баскакаў. Прысутныя ўсклалі на брацкую магілу вянок і мінутай маўчання ўшанавалі памяць загінуўшых у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў.

На факультэтах ГДУ прайшлі ўрокі мужнасці. Студэнты сустракаліся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, якія падзяліліся ўспамінамі аб тых суровых днях, якія на ўсё жыццё запалі ў іх сэрцы.

**(Наш кар.).**

# З В А Р О Т

## ТАВАРЫСТВА БАРАЦЬБЫ ЗА ЦВЯРОЗАСЦЬ ГДУ ДА ВЫКЛАДЧЫКАЎ, СУПРАЦОЎНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ УНІВЕРСІТЭТА

**Таварышы! Мы звяртаемся да Вас з заклікам асабістым прыкладам падтрымаць дзейнасць таварыства барацьбы за цвярозасць. Добраахвотнае таварыства барацьбы за цвярозасць — гэта арганізацыя тых, хто адмовіўся ад ужывання спіртных напіткаў і прыняў на сябе абавязак практычнага ўдзелу ў антыалкагольнай дзейнасці. Яе формы добра вядомы: ажыццяўленне наступальнай вуснай і друкаванай прапаганды, садзейнічанне выданню і распаўсюджванню антыалкагольнай літаратуры, дэманстрацыя дакументальных, навукова-папулярных фільмаў аб шкодзе алкаголю, распрацоўка і ўкараненне новых традыцый і абрадаў, садзейнічанне арганізацыі змястоўнага і разумнага адпачынку працоўных, шырокае прыцягненне ўсіх да ўдзелу ў спартыўна-аздараўленчых мерапрыемствах, выяўленне прычын узнікнення п'янства.**

**Наша мэта — выкараненне п'янства. Гэта мэта высакародная, і таму для яе дасягнення не трэба шкадаваць намаганняў, яна павінна згуртаваць сумленных і свядомых людзей універсітэта.**

**Членамі добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць могуць быць грамадзяне, якія дасягнулі 18 гадоў і паказваюць прыклад цвярозага ладу жыцця і дастойных паводзін у грамадстве і быце.**

**Заявы аб прыёме ў члены Усесаюзнага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць падаюцца на імя старшыні пярвічнай арганізацыі таварыства (кафедра ГА і медпадрыхтоўкі).**

**Наш дэвіз: цвярозасць — норма жыцця.**

**ПРАЎЛЕННЕ ТАВАРЫСТВА БАРАЦЬБЫ ЗА ЦВЯРОЗАСЦЬ ГДУ.**

# ВЫКЛЮЧАНЫ З ЧЛЕНАЎ ПРАФСАЮЗА

Рабочы гаспдагаворнай тэмы, якую выконвае кафедра радыёфізікі, Г. Р. Арцёмаў любіў прыкласціся да чаркі. І хаця ён добра ведаў, што з аматарамі выпівак цяпер вядзецца бязлітасная барацьба, ад шкоднай прывычкі не пазбавіўся. Аднойчы ён з'явіўся на работу ў нецвярозым стане. Атрымаў за гэта па заслугах. Яго выключылі з членаў прафсаюза.

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

**У снежні г. г. рэкамендуецца правесці палітычныя інфармацыі і гутаркі на тэмы:**

### I. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ.

**1. Аснова ідэйнага адзінства партыі** (аб праекце новай рэдакцыі Праграмы КПСС).

Матэрыялы па гэтай тэме апублікаваны ў газеце «Правда» (27 кастрычніка), часопісе «Агитатор» (№ 22 за 1985 г.).

**2. Стратэгія і тактыка паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны** (аб праекце Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года).

Рэкамендуецца выкарыстоўваць матэрыялы, апублікаваныя ў газетах «Правда» (10 лістапада), «Советская Белоруссия» (11 лістапада), часопісе «Агитатор» (№ 22 за 1985 г.).

**3. Нормы жыцця партыі — арыенцір для ўсіх** (аб праекце Статута КПСС з прапануемымі змяненнямі).

Матэрыялы па гэтай тэме апублікаваны ў газетах «Правда» (3 лістапада), «Известия» (5 лістапада), бюлетэні «Аргументы и факты» (№ 46 за 1985 г.).

### II. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ.

**4. На шляху да міру без войнаў, без зброі** (да вынікаў сустрэчы Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова і прэзідэнта ЗША Р. Рэйгана ў Жэневе).

### III. ПЫТАННІ ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ.

**5. Паспяхова завяршым заданні фінішнага года пяцігодкі** (аб патрыятычным абавязку працаўнікоў горада і вёскі прымножыць творчыя намаганні на завяршальным этапе года, забяспечыць безумоўнае выкананне планавых заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў па ўсіх паказчыках).

Матэрыялы публікуюць усе газеты.

**6. Наш дом: рэзервы эканоміі** (аб беражлівых адносінах усіх і кожнага да расходавання вады, цеплавой і электрычнай энергіі ў быце).

Матэрыял публікуе газета «Советская Белоруссия», гл. таксама часопіс «Агитатор», № 22 за 1985 г.

### IV. ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ І КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ.

**7. «Масавая культура» ў арсенале ідэалагічнай барацьбы** (аб спробах буржуазнай прапаганды атруціць свядомасць людзей сродкамі «масавай культуры», зрабіць іх успрымальнымі да індывідуалізму, мяшчанскага накапіцельства, ідэйнай і культурнай усееднасці).

Матэрыял апублікаваны ў часопісе «Международная жизнь» № 10 за 1985 г.



## ЖЫЦЦЁ БІЯЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

### СТУДЭНТЫ — ШКОЛЕ

# ДЛЯ ЭКАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Вялікая разнастайнасць форм праяўлення жывой прыроды, якія з развіццём прамысловасці адчуваюць узрастаючы ўплыў чалавека. І вельмі дрэнна, калі ён становіцца браканьерам, знішчальнікам тых яе форм, якія патрабуюць пастаянных клопатаў і аховы.

Адно з галоўных пытанняў, якое вырашаюць выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта, — гэта экалагічнае выхаванне школьнікаў, якое ў век НТР выходзіць на першае месца, бо з тых часоў, як чалавек узяў у рукі стрэльбу, знікла каля 300 відаў жывёлін.

Важнай формай экалагічнага выхавання, якая дзейнічае на працягу ўсяго года, з'яўляецца гуртковая работа. У яе арганізацыі і правядзенні актыўны ўдзел прымаюць студэнты М. Кечанкоў, Н. Кіслова, Л. Юпатава, Н. Сохар.

На базе кафедры заалогіі і аховы прыроды працуе гурток «Юны эколаг». За два гады яго існавання накапіўся цэўны вопыт, які патрабуе абагульнення і распаўсюджвання.

Заняткі ў гуртку ўключаюць аўдыторныя і пазаўдыторныя формы работы. Аўдыторныя — гэта правядзенне заняткаў па цікавых і актуальных пытаннях заалогіі, вывучэнне агульнай характарыстыкі і экалогіі пазваночных жывёлін. Пры раскрыцці кожнай тэмы ўказваецца на стан асобных відаў і неабходнасць іх аховы.

Неаўдыторная форма работы ўключае шмат напрамкаў, але самыя галоўныя — работа на экалагічнай сцежцы, экскурсіі і арганізацыя летняга экспедыцыйнага лагера «Эколаг».

Усё названае вышэй прадугледжвае паляпшэнне экалагічнага выхавання школьнікаў. У прыватнасці, што азначае экалагічная сцежка? Яе працягласць — 3,5 км. Яна праходзіць па ўчастках лесу з рознай ступенню антрапагеннага ўздзеяння і ўключае лісіны гарадок, часальні дзіка і гняздоўі дзённых драпежных птушак. У час работы на гэтай сцяжынцы, знаёмячыся з біялогіяй некаторых жывёлін, адчуваючы адмоўнае ўздзеянне чалавека, вучні пераконваюцца ў неабходнасці аховы жывой прыроды і змагаюцца з браканьерствам і безгаспадарчасцю.

Экскурсійная работа праводзіцца ў Гомелі і прымыкаючым да яго зялёным масіве. Вывучаючы зімовую арнітафауну горада, рабяты пераконваюцца ў неабходнасці аказання дапамогі зімуючым відам птушак. Дома і ў школе яны вырабляюць кармушкі, падкормачныя столікі і займаюцца біялагічнымі назіраннямі. Вынікі экскурсій і назіранняў абмяркоўваюцца ў школе.

Пасля двухгадовага навучання ў гуртку «Юны эколаг» вучні прымаюць удзел у рабоце летняга экспедыцыйнага лагера «Экалогія». Сёлета лагер размяшчаўся ў Рэчыцкім раёне, дзе працавала і студэнцкая экспедыцыя «Бярэзіна». У ходзе сумесных даследаванняў школьнікі здолелі паглыбіць свае веды па экалогіі некаторых відаў жывёлін і выканалі самастойныя навуковыя работы. Збор матэрыялу і яго апрацоўка дазволіць у рамках дзён біялогіі правесці ў школе першую вучнёўскую канферэнцыю па здабытках сваёй навуковай працы.

Уся гэтая планамерная і сістэматычная работа спрыяе атрыманню станоўчых вынікаў у экалагічным выхаванні школьнікаў. Думаецца, што з цягам часу будзе ўсё менш і менш зламаных дрэўцаў, знішчаных земнаводных, разбураных гнёзд птушак, муравейнікаў.

**А. КУСЯНКОЎ,**
**аспірант кафедры заалогіі і аховы прыроды, кіраўнік гуртка «Юны эколаг».**
**М. КУПРАЦЭВІЧ,**
**камандзір Дружыны па ахове прыроды.**

# ДАЛУЧЭННЕ да навуковага пошуку

Вясной бягучага года на базе кафедры заалогіі і аховы прыроды біяфака быў створан студэнцкі навукова-вытворчы атрад «Эколаг». Асноўная яго мэта — аказваць кваліфікаваную дапамогу рыбгасу «Трэмля» вытворчага аб'яднання «Гомельрыбгас». Адной з важнейшых задач атрада мы лічым прыцягненне да актыўнай навукова-даследчай работы як мага большай колькасці студэнтаў.

Тэматыка работ СНВА «Эколаг» вызначаецца выконваемым гаспадарчым дагаворам, які заключан кафедрай. Асноўнымі напрамкамі распрацовак, якія выконваюць цяпер студэнты, з'яўляюцца вывучэнне натуральнай кармавой базы нагульных сажалак рыбгаса «Трэмля» і заканамернасцей росту карпа на другім годзе жыцця, вывучэнне працэсаў вынасу рэчываў і энергіі з розных вадаёмаў гаспадаркі і інш. Формы ўдзелу студэнтаў у рабоце СНВА залежаць ад узроўню прафесіянальнай падрыхтоўкі.

З красавіка і да гэтага часу ў рабоце атрада прымалі ўдзел 12 чалавек, два з якіх з'яўляюцца стажорамі і будуць залічаны ў атрад у канцы бягучага года. Асноўнай задачай атрада з красавіка па чэрвень з'яўлялася апрацоўка сабраных у летняй і зімовай экспедыцыях 1984-85 гг. матэрыялаў: апрацоўка іхтыялагічнага матэрыялу — выяўленне ўзроставага саставу папуляцый карпа, матэматычная апрацоўка даных і г. д. Гэтая частка работы праводзілася пад кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле дацэнта Я. Я. Падутава. Апрацаваны матэрыялы па высвятленню паразіталагічнай сітуацыі ў раёне нагульных сажалак, берагоў і меліярацыйных каналаў гаспадаркі і натуральных вадаёмаў у пойме р. Бярэзіны. Гэту работу курыравалі аспіранты кафедры Б. К. Кулназараў, В. В. Шымалаў. Да пачатку новага экспедыцыйнага сезона былі апрацаваны матэрыялы, сабраныя па арыгінальнай методыцы, прапанаванай супрацоўнікамі кафедры. Вынікам даследаванняў студэнтаў І. Балоцінай, А. Фешчанка, А. Нікалаенка, Т. Булянковай з'явілася ўстанаўленне заканамернасцей сезоннай дынамікі натуральнай кармавой базы рыб.

З захапленнем і вялікай самаададачай працавалі студэнты па распрацоўцы тэматыкі атрада ў саставе летніх экспедыцый: комплекснай экспедыцыі ВНВА «Фауна Палесся» і жнівеньскай экспедыцыі па вывучэнню вынасу рэчыва і энергіі з вадаёмаў. Асабліва трэба адзначыць работу пяцікурснікаў А. Сіманава, П. Лазаковіча, В. Каптура, а таксама студэнта 1-га курса І. Зуба, які праявіў сябе як вельмі захоплены і ўлюблёны ў заалогію чалавек.

Нягледзячы на кароткі тэрмін існавання атрада, хочацца адзначыць, што такая форма работы ўжо добра сябе зарэкамендавала. Яна дазваляе зацікавіць студэнтаў навуковым пошукам, дае ім магчымасць паўней раскрыць свае творчыя здольнасці.

**А. СІЛІНА,**
**аспірантка кафедры заалогіі і аховы прыроды, камандзір СНВА «Эколаг»,**
**З. СКАЧКОВА,**
**студэнтка 3-га курса біяфака, стажор атрада.**

# У КАЎКАЗСКІМ ЗАПАВЕДНІКУ

**Запаведнік — самая высокая** і адказная, самая рэальная і значная форма тэрытарыяльнай аховы прыроды. На запаведных землях спыняецца гаспадарчая дзейнасць чалавека, гэтыя тэрыторыі дзяржава адводзіць для навуковых і культурна-асветных мэт.

Агульная колькасць запаведнікаў, запаведна-паляўнічых гаспадарак і нацыянальных паркаў у СССР наблізілася да 150, а іх сумарная плошча складае 15 мільёнаў га.

Урадам нашай краіны прыняты закон «Аб ахове і выкарыстанні жывёльнага свету». Гэты дакумент афіцыйна ўстанаўлівае важнейшыя прынцыпы аховы жывёлін. Абмяжоўваецца такое звыклае для нас раздзяленне жывёлін на карысных і шкодных, прызнаецца права кожнага віда на існаванне ў прыродных умовах.

Працягваючы традыцыю, у жніўні бягучага года група студэнтаў біялагічнага факультэта ГДУ выязджала ў Каўказскі дзяржаўна-біясферны запаведнік, які размяшчаецца ў заходняй частцы галоўнага хрыбта Каўказскіх гор. Разнастайнасць ландшафту абумовіла багацце жывёльнага і расліннага свету запаведніка. Тут водзяцца серны і кубанскія туры, алені і дзікі, мядзведзі і рысі. Сюды завезены раней знішчаныя зубры. У запаведніку вядуцца вялікія навуковыя даследаванні, у тым ліку і па міжнародных праграмах.

Асноўнай нашай работай у запаведніку з'яўляўся ўлік зубраў і іншых буйных млекакормячых. Сутнасць такога ўліку заключалася ў наступным. Звычайна зубры трымаюцца статкамі на пэўнай тэрыторыі. Такія ўчасткі вядомы і там штогод праводзяцца ўлікі колькасці пагалоўя. Зубры днём трымаюцца ў лесе або іншых укрыццях, а вечарам, да заходу сонца, збіраюцца на пэўных участках лугоў і ўстройваюць лежні. Здалёк іх можна адрозніць па плямах вытаптанай зямлі. Калі сонца асвеціць вяршаліны гор, зубры па пратаптаных сцежках вяртаюцца ў лясы. Вось у гэты момант, разбіўшыся для большай эфектыўнасці на групы, мы займаем загадзя вядомыя месцы назірання і вядзем улік зубраў, іншых млекакормячых. На першы погляд, усё гэта проста і лёгка. А на справе ёсць няімала складанасцей. Яны звязаны з пераходам у горных умовах з аднаго месца на другое. Даводзілася перамяшчацца па вузкіх горных сцяжынках з цяжкімі рукзакамі за спіной, карабкацца ад мядзведзя на дрэва, сцягваць з сябе верхняе адзенне і махаць ім перад мордай невядома адкуль з'явіўшагася зубра (ён баіцца вяртальных рухаў), дрыжаць ад холаду ноччу і знемагаць ад спякоты днём.

Але навокал была такая цудоўная прырода (яркія фарбы лугоў, п'янлівы пах кветак, чыстае бяздоннае неба), што мы проста не заўважалі цяжкасцей. Колькі цікавага спазналі мы ў запаведніку! Дзе яшчэ маглі мы ўбачыць і нават спускацца ў карставыя калодзежы, даставаць рукой да сталактыкаў у пячорах, загараць на снезе?

Вяртаючыся дамоў, мы думалі аб тым, што ўвесь гэты цудоўны свет мы маглі ўбачыць побач, у суседнім лесе. І не патрэбны былі б запаведнікі, калі б чалавек навучыўся беражліва адносіцца да прыроды.

**А. НІКАЛАЕЎ,**
**камандзір атрада «Запаведнік», член Дружыны па ахове прыроды, студэнт 4-га курса біяфака.**



**На здымках:** 1. Студэнты біяфака ГДУ ў Каўказс к і м запаведніку. 2. Адзін з маляўнічых яго куточкаў.

Фота А. Ляшчова.



